УДК 947.6

# РЭЭВАКУАЦЫЯ ВЫМУШАНЫХ МІГРАНТАЎ З БЕЛАРУСІ: УДЗЕЛ БЕЛАРУСКІХ БЕЖАНСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ У КААРДЫНАЦЫІ ПРАЦЭСУ (1917–1918)

***В. Р. КАРНЯЛЮК***[1*]

[1*]*Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, вул. Э. Ажэшка, 22, 230023, г. Гродна, Беларусь*

Вывучаецца адна з самых складаных старонак гісторыі вымушанай міграцыі з Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны – рээвакуацыя 1917–1918 гг. Даследуюцца месца і маштаб удзелу беларускіх бежанскіх арганізацый у каардынацыі гэтага працэсу. Адзначана, што працягласць рээвакуацыі і ўдзел у ёй прадстаўнікоў улады, якая змянялася ў Расіі ў ходзе рэвалюцыйных узрушэнняў некалькі разоў, дазваляюць убачыць магчымасці ўздзеяння на беларускіх бежанцаў розных палітычных сіл, у тым ліку беларускіх. На падставе новых матэрыялаў Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі, матэрыялаў перыядычнага друку 1917–1918 гг. і найноўшых даследаванняў па гісторыі бежанства сцвярджаецца, што ўцекачы палохалі палітыкаў сваёй разнастайнасцю, а таксама звязаным з іх прысутнасцю комплексам бытавых праблем, прыярытэтных у параўнанні з пытаннямі палітычнага ўплыву для саміх мігрантаў. Зроблена выснова аб вельмі абмежаваным уплыве на бежанцаў з боку беларускіх палітыкаў. Выказана думка пра тое, што ключавое ўздзеянне на мігрантаў у ходзе рээвакуацыі аказвалі савецкія органы ўлады, якія імкнуліся трымаць пад кантролем усе аспекты дэпартацыі насельніцтва.

***Ключавыя словы:*** бежанства; рээвакуацыя; вымушаныя мігранты з Беларусі; Першая сусветная вайна.

**Образец цитирования:**
Карнялюк В. Р. Рээвакуацыя вымушаных мігрантаў з Беларусі: удзел беларускіх бежанскіх арганізацый у каардынацыі працэсу (1917–1918) // Часоп. Беларус. дзярж. ун-та. Гісторыя. 2017. № 4. С. 41–49.

**For citation:**
Karnialiuk V. R. Re-evacuation of forced migrants from Belarus: Belarusian refugee agencies and organizations in the coordination process (1917–1918). *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2017. No. 4. P. 41–49 (in Belarus.).

**Автор:**
***Виталий Григорьевич Корнелюк*** – кандидат исторических наук, доцент; доцент кафедры туризма и культурного наследия факультета истории, коммуникации и туризма.

**Author:**
***Vitaly R. Karnialiuk***, PhD (history), docent; associate professor at the department of tourism and cultural heritage, faculty of history, communication and tourism.
*zrumljowa@mail.ru*

Журнал Белорусского государственного университета. История. 2017. № 4. С. 41–49
Journal of the Belarusian State University. History. 2017. No. 4. P. 41–49

# РЕЭВАКУАЦИЯ ВЫНУЖДЕННЫХ МИГРАНТОВ ИЗ БЕЛАРУСИ: УЧАСТИЕ БЕЛОРУССКИХ БЕЖЕНСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ В КООРДИНАЦИИ ПРОЦЕССА (1917–1918)

***В. Г. КОРНЕЛЮК*** [1)]

[1)]*Гродненский государственный университет им. Янки Купалы, ул. Э. Ожешко, 22, 230023, г. Гродно, Беларусь*

Изучается одна из самых сложных страниц истории вынужденной миграции из Беларуси в годы Первой мировой войны – реэвакуация 1917–1918 гг. Исследуются место и масштаб участия белорусских беженских организаций в его координации. Отмечено, что продолжительность реэвакуации и участие в ней представителей власти, которая сменялась в России в ходе революционных потрясений несколько раз, позволяют увидеть возможности воздействия на белорусских беженцев различных политических сил, в том числе белорусских. На основании новых материалов Государственного архива Российской Федерации, материалов периодической печати 1917–1918 гг. и новейших исследований по истории беженства утверждается, что беженцы настораживали политиков своей этнической и социально-экономической пестротой, а также связанным с их присутствием комплексом бытовых проблем, приоритетных в сравнении с вопросами какого-либо политического влияния для мигрантов. Сделан вывод о весьма ограниченном влиянии на беженцев со стороны белорусских политиков. Высказано мнение о том, что ключевое воздействие на мигрантов в ходе реэвакуации оказывали советские органы власти, которые стремились держать под контролем все аспекты депортации населения.

***Ключевые слова:*** беженство; реэвакуация; вынужденные мигранты из Беларуси; Первая мировая война.

# RE-EVACUATION OF FORCED MIGRANTS FROM BELARUS: BELARUSIAN REFUGEE AGENCIES AND ORGANIZATIONS IN THE COORDINATION PROCESS (1917–1918)

***V. R. KARNIALIUK*** [a]

[a]*Yanka Kupala State University of Hrodna, 22 E. Ažeška Street, Hrodna 220023, Belarus*

The article is devoted to one of the most difficult pages in the history of forced migration from Belarus in the World War I – the period of re-evacuation 1917–1918 – time changes in the coordination of this migration process. The research problem and the scale of participation of Belarusian refugee organizations in the coordination of this process. Its duration and participation of various authorities, which succeeded each other in Russia during the revolutionary turmoil re-evacuation of telepremera research, as it allows you to see the possibilities of influence on the Belarusian refugees of various political forces, including and Belarusian. Based on new materials of the State archive of the Russian Federation, materials of periodicals of 1917–1918 and the latest research on the history of refugee status, the article notes that refugees alarmed the politicians of their ethnic and socio-economic diversity and connectedness with complex domestic problems, which for them was a priority compared to the issues some political influence. The author concludes on a very limited influence on the refugees by Belarusian politicians. A key influence, according to the author, migrants during re-evacuation were provided by the Soviet authorities who sought to control all aspects of the deportation of the population.

***Key words:*** refugees; re-evacuation; forced migrants from Belarus; the World War I.

## Уводзіны

У гісторыі вымушанай міграцыі з Беларусі 1914–1923 гг. перыяд рээвакуацыі займае асобнае месца. Адметнасць гэтага працэсу заключаецца ў тым, што ён адбываўся ва ўмовах зменлівай міграцыйнай палітыкі. Пытанні яго каардынацыі шчыльна звязаны з праблемамі эфектыўнасці кіравання ўсім бежанскім рухам. На падставе новых матэрыялаў з крыніц Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі (Масква), Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна, выданняў перыядычнага друку 1917–1918 гг., а таксама вынікаў найноўшых даследаванняў гісторыі бежанства (працы В. Бахурына, І. Бяловай, У. Ляхоўскага, А. Прымака-Онішка, В. Саматыі, А. Чарнякевіча) намі зроблена спроба вызначыць ступень удзелу беларускіх бежанскіх арганізацый і ўстаноў у каардынацыі працэсу рээвакуацыі бежанцаў з Беларусі. Можам зрабіць папярэднюю выснову пра тое, што, калі б беларускія арганізацыі і ўстановы ў пэўных умовах здолелі ажыццявіць каардынацыю бежанцаў з Беларусі, яны атрымалі б шматтысячную армію сваіх прыхільнікаў.

## Асноўная частка

Вяртанне дадому з'яўлялася галоўнай мэтай пераважнай большасці бежанцаў і асоб, эвакуіраваных з усіх заходніх губерняў Расійскай імперыі. Таму пераконваць іх у неабходнасці вяртання ніколі не было патрэбы, стаяла задача арганізаваць рээвакуацыю.

Масава працэс рээвакуацыі пачаўся ў 1917 г., галоўным штуршком да яе стала, безумоўна, рэвалюцыйная катастрофа ў Расіі.

Паколькі вяртанне мігрантаў адбывалася не проста паэтапна, а з вялікай колькасцю прыпынкаў, выкліканых ваеннымі і палітычнымі абставінамі 1917–1921 гг., працэс знаходжання бежанцаў у рээвакуацыйным руху расцягваўся на тыдні, месяцы, а часам і на гады. Такі рух патрабаваў перманентнага вырашэння ўсяго комплексу пытанняў жыццезабеспячэння бежанцаў: жылля, харчавання, санітарна-медыцынскай дапамогі. Плённа такую міграцыйную палітыку маглі ажыццяўляць структуры з адпаведнымі адміністратыўнымі і фінансавымі магчымасцямі.

Даследчыкі бежанскага руху ўжо адзначылі і ацанілі галоўныя крокі, якія рабіла кожная новая расійская ўлада ў справе рээвакуацыі 1917–1918 гг. У Расійскай імперыі працэсам бежанскага руху кіравалі афіцыйныя дзяржаўныя ўстановы. Распараджэнні, неабходныя для арганізацыі ўсіх рээвакуацыйных мерапрыемстваў, даваліся ўрадам Упраўленню галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночнага і Заходняга франтоў («Северопомощь»), галоўнаўпаўнаважаным па франтах і ўнутры імперыі, а таксама Камітэтам вялікай княжны Таццяны Мікалаеўны для аказання часовай дапамогі пацярпелым ад ваенных дзеянняў (Таццянінскі камітэт).

Ад асобай нарады дапамогі бежанцам пры Міністэрстве ўнутраных спраў адпаведныя распараджэнні адпраўляліся ў згаданыя вышэй арганізацыі, перадаваліся губернатарам і далей – праз выканаўчыя камісіі губернскіх земскіх камітэтаў – у выканаўчыя камісіі пры павятовых земскіх камітэтах і гарадскія камітэты па справах бежанцаў пры гарадскіх управах, адкуль, у сваю чаргу, накіроўваліся ў адмысловыя ніжэйшыя валасныя, участковыя і гарадскія папячыцельствы. Адначасова ад губернскага праўлення паступалі распараджэнні земскім начальнікам і паліцэйскім спраўнікам. На міністэрскім узроўні свае задачы таксама атрымліваў Галоўны па забяспячэнні арміі камітэт Усерасійскіх земскага і гарадскога саюзаў (Земгар) і нацыянальныя бежанскія арганізацыі. Апошнія мелі шчыльныя кантакты з Таццянінскім камітэтам. Па згаданых адміністратыўных кірунках пералічваліся і адпаведныя дзяржаўныя сродкі, якія і з'яўляліся асноўнай (у параўнанні з рознымі ахвяраваннямі) крыніцай фінансавання. Пераважна за гэтыя сродкі дзейнічалі таксама ўсе нацыянальныя арганізацыі дапамогі пацярпелым ад вайны, якія мелі часам яшчэ і дадатковыя крыніцы фінансавання.

Пры Часовым урадзе агульнай справай каардынацыі міграцыйнай палітыкі займаўся асобны міжведамасны камітэт па папярэдняй распрацоўцы плана харчовых і санітарных мерапрыемстваў падчас дэмабілізацыі войска і зваротнага вяртання бежанцаў, першае пасяджэнне якога адбылося, аднак, толькі 21 кастрычніка 1917 г. [1, с. 113].

У лютым 1917 г. Таццянінскі камітэт быў аб'яднаны з асобым аддзелам дапамогі пры Міністэрстве ўнутраных спраў. Пазней у гэтым жа годзе на базе Таццянінскага камітэта была арганізавана часовая калегіяльная структура – Усерасійскі камітэт аказання дапамогі пацярпелым ад ваенных дзеянняў, у склад якога ўвайшлі ўсе буйныя ўстановы, якія прымалі ўдзел у справе падтрымкі бежанцаў. Новая арганізацыя спыніла дзейнасць пасля прыходу да ўлады бальшавікоў, але перад гэтым, на II з'ездзе прадстаўнікоў мясцовых аддзяленняў былога Таццянінскага камітэта 16–19 красавіка 1917 г., у адпаведнасці з тагачаснай палітычнай атмасферай у краіне, падкрэслівалася, што «ўсе аддзяленні камітэта павінны былі кіравацца выбарным пачаткам для камплектавання сваіх прэзідыумаў і прынцыпам дэмакратызацыі сваіх устаноў»[1] [2, с. 34].

З 19 па 25 лістапада 1917 г. у Маскве праходзіў II Усерасійскі з'езд бежанцаў, дэлегаты якога накіравалі губернскім Саветам дэпутатаў рэзалюцыю з прапановамі «правільнай» арганізацыі дапамогі бежанцам. На месцах з'явіліся губернскія (потым – павятовыя, валасныя) Саветы бежанцаў. Гэтыя органы разглядалі ўсе актуальныя праблемы штодзённага жыцця бежанцаў. Але з 1 ліпеня 1918 г. павятовыя Саветы бежанцаў былі ліквідаваны [3, с. 281, 285, 289, 291]. У складзе Наркамата па ваенных справах РСФСР у красавіку 1918 г. была створана Цэнтральная калегія па справах ваеннапалонных і бежанцаў (Цэнтрпалонбеж), якая ўжо ў маі 1919 г. перадавалася ў падпарадкаванне Наркамата ўнутраных спраў РСФСР [4]. Па распараджэнні Цэнтрпалонбежа адпаведныя дзеянні выконвалі такія арганізацыі і ўстановы, як Галоўнае ваенна-санітарнае ўпраўленне, Расійскае таварыства Чырвонага Крыжа, аб'яднаныя Усерасійскі земскі і гарадскі саюзы, органы Народнага камісарыята аховы здароўя[2]. З пачатку 1920 г. справай вымуша-

[1]Тут і далей пераклад наш. – *В. К.*
[2]Дзянніца. 1918. 25 кастр. (№ 35).

ных мігрантаў кіравала Цэнтральнае ўпраўленне па эвакуацыі насельніцтва (Цэнтрэвак) [3, с. 292].

Такое рэфармаванне сістэмы дапамогі вымушаным мігрантам пацягнула пераразмеркаванне не толькі маёмасці ранейшых арганізацый, але і іх функцый. Падчас гэтага рэфармацыйнага працэсу ў каардынацыю рээвакуацыі бежанцаў паспрабавалі ўключыцца розныя грамадскія нацыянальныя арганізацыі. Сярод іх былі і тыя, што арыентаваліся найперш на велізарную масу бежанцаў з Беларусі.

Аб тым, што ў 1917 г. бежанскае пытанне бачылася беларускім палітыкам прыярытэтным, сведчыць той факт, што ўжо на другі дзень працы І Усебеларускага кангрэса па патрабаванні А. Цвікевіча яно разглядалася другім па чарзе пасля пытання пра палітычнае становішча краіны і лёс Беларусі. Пры гэтым кірункі актыўнага ўдзелу ў бежанскім пытанні беларускага боку, акрэсленыя ў прамове А. Цвікевіча «Стан рэчаў дапамогі бежанцам і задачы з’езда ў гэтай справе», былі цалкам слушнымі і практычнымі і пацвярджалі, што беларускія палітычныя лідары мелі рацыянальнае бачанне вырашэння дадзенай праблемы[1].

Бежанцы ў сваім руху дадому чуйна рэагавалі на ўсе крокі розных арганізацый і ўстаноў, уключаных у працэс рээвакуацыі. З верасня 1917 па люты 1918 г. тэрыторыі Мінскай, Віленскай і Магілёўскай губерняў, не акупаваныя немцамі, знаходзіліся ў штучным часовым ваенна-палітычным аб’яднанні, якое называлася «Заходняя вобласць», з цэнтрам спачатку ў Мінску, а з лютага – у Смаленску [5, с. 59][2]. Паўднёвыя землі Беларусі – Брэсцкі, Кобрынскі, Пінскі, Мазырскі, Рэчыцкі і часткова Пружанскі паветы – трапілі пад адміністратыўны ўплыў Украінскай Народнай Рэспублікі пры фактычным кантролі гэтых тэрыторый з боку акупацыйнай нямецкай адміністрацыі [6, с. 234]. У выніку 32 жыхары Кобрынскага павета, якія жылі ў бежанстве ў Мосальскім павеце, у лісце ў калужскае губернскае ўпраўленне па справах палонных і бежанцаў (губпленбеж) у маі 1918 г. папрасілі, каб іх адправілі або дадому, або ў адну з паўднёвых губерняў, населеных «аднаплямёнными братамі Маларосіі», такімі ж, як яны «па веры і нацыянальнасці», і спасылаліся на факт адыходу па міжнародных пагадненнях іх родных зямель да Маласорсіі[3]. У сувязі з гэтым узнікае пытанне: якая нацыянальная арганізацыя павінна была ўключыцца ў справу вяртання гэтых людзей – беларуская, украінская альбо руская? Кожная мела свае падставы праявіць актыўнасць у гэтай справе. З трыбуны Усерасійскага з’езда бежанцаў з Беларусі ў Маскве, які адбыўся 15–21 ліпеня 1918 г., З. Жылуновіч прамовіў: «Раней мы не ведалі, што мы беларусы…». Тым не менш вымушаных беларускіх мігрантаў адпаведныя арганізацыі і ўстановы працягвалі бачыць рускімі або палякамі[4]. У такіх абставінах тыя грамадскія і палітычныя дзеячы, якія спрабавалі вырашаць праблемы бежанцаў, мусілі імкнуцца да палітычнага кампрамісу і мець палітычную празорлівасць ды гнуткасць. Адметным ў гэтым плане з’яўляецца прыклад дзейнасці А. Цвікевіча ў маскоўскім аддзяленні арганізацыі «Беларуская народная грамада». Нягледзячы на істотную розніцу ў палітычных поглядах яе членаў, палітык здолеў ажыццявіць пэўныя крокі з мэтай практычнай дапамогі бежанцам-беларусам, якія апынуліся ў адной са сталіц Расіі[5]. Па звестках газеты «Дзянніца», якая выступала як сродак асветы найперш маскоўскай часткі беларускіх бежанцаў, пра іх заўважную культурную актыўнасць сведчылі перыядычныя зборы беларусаў у Маскве, стварэнне беларускага хору, завязванне кантактаў больш чым з 60 культурна-асветніцкімі беларускімі арганізацыямі па ўсёй Расіі[6].

Таму, стоячы на трыбуне І Усебеларускага кангрэса, А. Цвікевіч разумеў тое, да чаго заклікаў стракатую масу дэлегатаў. Менавіта на такую комплексную, аператыўную і, разам з тым, палітычна карэктную дзейнасць накіроўваў ён сваіх калегпалітыкаў пазней, настойваючы на стварэнні Беларускага краёвага эканамічнага савета з «маёмасцю і капіталамі ваенна-грамадскіх, тэхнічных і санітарных арганізацый, якія знаходзіліся ў межах Беларусі»[7]. Такая пазіцыя па пытанні бежанцаў пераклікаецца са зместам звароту да ўдзельнікаў з’езда беларусаў-інвалідаў і бежанцаў, які адбыўся 28–29 лістапада 1917 г. у зале Цэнтральнай вайсковай беларускай рады (ЦВБР). У гэтай адозве можна адзначыць такія акцэнты, як заклік да аб’яднання намаганняў, гуртавання вакол Вялікай беларускай рады (ВБР) як «адзінага правамочнага органа ўсёй Беларусі». Акрамя таго, фармулявалася абяцанне ад імя ВБР і ЦВБР «выкарыстаць усе магчымасці, каб вярнуць бежанцаў на свае папялішчы»[8]. Разгон

[1]Беларуская Рада. 1917. 17 снеж. (№ 11).

[2]Резолюция II съезда Советов Западной области о создании области (г. Смоленск, 11 апреля 1918 г.) // Государственные границы Беларуси : сб. документов и материалов : в 2 т. Минск : БГУ, 2012. Т. 1 : Март 1917 – ноябрь 1926 / сост.: В. Е. Снапковский [и др.]. С. 33–34.

[3]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. Р-3333. Оп. 7. Ед. хран. 8. Л. 128–128 об.

[4]Протоколы, постановления и материалы Всероссийского съезда беженцев из Белоруссии в Москве 15–21 июля 1918 года. М. : Издательство Белорусского Национального комиссариата, 1918. С. 17.

[5]От собственного корреспондента // Белорус. эхо. 1918. 3 июня (№ 2). С. 2.

[6]Дзянніца. 1918. 7 чэрв. (№ 15). С. 4.

[7]К съезду инвалидов и беженцев // Великая Рада. 1917. 27 нояб. (№ 2). С. 3.; 30 нояб. (№ 3). С. 3.

[8]Беларуская Рада. 1917. 17 снеж. (№ 11).

кангрэса не дазволіў рэалізаваць абвешчаныя на ім планы вырашэння бежанскага пытання. Бальшавіцкія органы ўлады не збіраліся аб’ядноўваць намаганні з беларускімі некамуністычнымі лідарамі.

Аднак своеасаблівым прыкладам такога аб’яднання намаганняў быў створаны 31 студзеня 1918 г. Беларускі нацыянальны камісарыят (Белнацкам), пры якім функцыянаваў аддзел па пытаннях бежанцаў на чале з І. Яхімовічам. Аддзел праводзіў актыўную працу па арганізацыі адпраўкі бежанцаў, вёў перапіску з бежанскімі арганізацыямі на месцах і асобнымі бежанцамі, ажыццяўляў перапіс вымушаных мігрантаў. Вядома, што розныя адміністратыўныя ўлады – савецкая, нямецкая, літоўская, украінская, польская – патрабавалі ад мігрантаў шмат дакументаў для перасячэння мяжы[1]. Структуры Белнацкама імкнуліся дапамагаць у гэтым бежанцам-беларусам. Толькі за адзін месяц з 21 мая па 20 чэрвеня 1918 г. аддзелам па пытаннях бежанцаў Белнацкама пры Народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей РСФСР былі выдадзены 434 пасведчанні бежанцаў з адзнакай у кожным з іх нацыянальнасці «беларус»[2]. Былі і іншыя паспяховыя вынікі працы камітэта ў справе рээвакуацыі: яго намаганнямі ў Мінск вярнуўся мясцовы настаўніцкі інстытут, мужчынская казённая гімназія, інвентар рамеснай школы [7, с. 212].

Аднак, па словах В. Утгаф, камітэт, «апынуўшыся паміж варожымі грамадска-палітычнымі і дзяржаўнымі арганізацыямі... імкнуўся абараніць інтарэсы беларускіх бежанцаў, і на старонках свайго друку заклікаў іх ствараць свае нацыянальныя бежанскія камітэты, якія былі прызваны абараніць нацыянальныя і палітычныя правы беларусаў на тэрыторыі Расіі» [1, с. 104]. Рабілася гэта супрацоўнікамі Белнацкама ў тым ліку агітацыйнымі, асветніцкімі сродкамі з мэтай «абудзіць інертную масу, унесці ў яе розумы хаця б праблісκі грамадзянскай і нацыянальнай самасвядомасці» [1, с. 105]. Адным з органаў друку, на старонках якога бежанская тэма знайшла заўважнае месца, была газета «Дзянніца», што выходзіла намаганнямі З. Жылуновіча. Гэты штотыднёвік інфармаваў беларускую масу бежанцаў на іх роднай мове пра важныя для іх арганізацыйныя мерапрыемствы, якія праводзілі бежанскі аддзел Белнацкама і розныя іншыя беларускія арганізацыі[3]. На старонках газеты друкаваліся аб’явы пра падрыхтоўку агульнага беларускага бежанскага з’езда, паведамлялася пра магчымасць звароту да афіцыйных прадстаўнікоў камітэта ў розных гарадах Расіі і Беларусі[4].

Ацэньваючы дзейнасць Белнацкама ў каардынацыі бежанскага руху, адзначым, што беларускі змест у ёй пераплятаўся з камуністычным светапоглядам. Як слушна заўважыў В. Скалабан, дзейнасць Белнацкама была «значнай агітацыйна-палітычнай і арганізацыйнай <...> па прывабліванні беларусаў на тэрыторыі Савецкай Расіі, найперш сярод бежанцаў, на бок савецкай улады» [8, с. 15]. Такі падыход знаходзіў паразуменне ў значнай часткі бежанцаў з Беларусі, аднак не ва ўсіх. Белнацкам быў структурай савецкага дзяржаўнага органа і дзейнічаў як частка апарату ўлады – з адпаведнымі паўнамоцтвамі і адміністратыўнымі магчымасцямі. Аднак праз адсутнасць адзінства поглядаў у кіраўніцтве Белнацкама на праблему беларусізацыі школы беларускамоўныя адукацыйныя асяродкі, якімі ён апекаваўся, дзейнічалі толькі ў Петраградзе. У той жа час 100 тыс. руб., выдаткаваных Народным камісарыятам асветы РСФСР у маі 1918 г. на арганізацыю пазашкольнага навучання сярод бежанцаў-беларусаў, пайшлі на правядзенне прапагандысцкіх акцый, стварэнне наглядней агітацыі і выданне бальшавісцкай палітычнай літаратуры [3, с. 212–213]. Савецкім зместам дзейнасці Белнацкама можна патлумачыць тое, што 60 няўрадавых беларускіх арганізацый, большасць з якіх падтрымлівалі ВБР і выступалі супраць разгону І Усебеларускага кангрэса, былі ліквідаваны як «класава варожыя ў дачыненні да савецкай улады» [3, с. 214].

Газета «Дзянніца» як орган Белнацкама, мэтанакіравана спрыяла «адукацыйным і культурным патрэбам бежанцаў», якія прыхільна ставіліся да сацыялістычных ідэй [1, с. 106]. Аднак са зместу бежанскіх зваротаў і лістоў у розныя арганізацыі і ўстановы, у тым ліку структуры Белнацкама, мы бачым, што асноўнымі патрэбамі вымушаных мігрантаў, пра якія ідзе гаворка ў гэтых дакументах, былі харчаванне, адзенне, прытулак і магчымасць руху ў зваротным напрамку – дадому. Такі змест зваротаў спалучаўся са скаргамі бежанцаў на сваё гаротнае жыццё, якое стала яшчэ больш складаным з 1917 г.[5] Красамоўным прыкладам з’яўляецца ліст дыякана Іаана (Жыцінца), які служыў у кобрынскім саборы Святога Аляксандра Неўскага: «Звяртаемся да мясцовага насельніцтва за пакупкай хлеба, атрымліваем рашучую адмову. “Няма жыта, вы прыехалі – нас аб’елі”, – вось такі адказ», – чытаем у яго лісце[6].

Натуральнае імкненне бежанцаў вярнуцца на сваю гаспадарку знаходзіць адлюстраванне ў фактах страхавання імі нерухомасці на праця-

[1] Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. Р-3333. Оп. 7. Ед. хран. 10. Л. 286 об.
[2] Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. Р-3333. Оп. 2а. Ед. хран. 19. Л. 39, 58, 62, 63, 91, 142, 187, 236, 241, 313, 394, 409.
[3] Дзянніца. 1918. 7 чэрв. (№ 15). С. 1.
[4] Дзянніца. 1918. 25 кастр. (№ 35). С. 1.
[5] Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. Р-3333. Оп. 7. Ед. хран. 10. Л. 96-97, 128-128 об., 182, 193, 229–229 об.
[6] Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 6978. Оп. 1. Ед. хран. 750. Л. 112.

гу ўсяго перыяду вымушанай міграцыі. Так, згодна з ведамасцю страхавання, за 1916–1918 гг. у Вярховіцкім валасным праўленні Брэсцкага павета ў в. Калінкавічы 1843 гаспадары выплацілі 7814 руб. 41 кап. страхавых узносаў за 5018 сялянскіх пабудоў агульным коштам 882 129 руб. За той жа перыяд гаспадары Гожскай воласці Гродзенскага павета застарахавалі 2719 пабудоў агульным коштам 17 429 391 руб.[1] Аднак у абсалютнай большасці бежанцы ўсведамлялі, што будуць вяртацца, як трапна заўважыў адзін з іх, «на голы камень» [9, с. 265]. Адукацыя і культура ў такіх абставінах рээвакуацыі вельмі рэдка сустракаюцца ў ліку патрэб бежанцаў, адлюстраваных на старонках архіўных дакументаў. Выключэнні, вядома, ёсць: часам для абгрунтавання неабходнасці ў пайку ці іншай матэрыяльнай дапамозе ў бежанскім хадайніцтве вялася гаворка пра вучобу дзяцей і патрэбу яе працягваць[2]. Вось толькі для вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем Белнацкам не меў ні дастатковых эканамічных, ні дыпламатычных паўнамоцтваў. Слабым звяном гэтай адміністратыўнай структуры была таксама «тэхнічная непрыстасаванасць апарату камісарыяту… недахоп супрацоўнікаў і адсутнасць матэрыяльнай падтрымкі» [1, с. 108–109]. Вызначаная Аблвыкамзахам «абмежаванасць дзейнасці Белнацкама тэрыторыяй Савецкай Расіі і немагчымасць уплываць на насельніцтва этнічна беларускіх зямель», пра якую казаў У. Ляхоўскі, істотна змяншалі ўплыў дадзенай арганізацыі на працэс рээвакуацыі беларускіх бежанцаў [7, с. 214].

Такую функцыянальную непрыстасаванасць галоўнай савецкай беларускай установы таго часу да бежанскага пытання імкнуліся выкарыстаць іншыя арганізацыі.

Прыкладам паралельнай актыўнасці розных устаноў можна лічыць дзейнасць гродзенскага аддзялення Усерасійскага камітэта дапамогі ахвярам вайны – спадкаемцу Таццянінскага камітэта. Яно аб'ядноўвала вакол сябе самыя розныя арганізацыі, якія, у сваю чаргу, злучалі грамадскія структуры розных груп насельніцтва губерні[3]. Згаданая разнастайнасць арганізацый сведчыць пра складанасць каардынацыі дзеянняў паміж імі. Існавала таксама Аб'яднанне грамадскіх арганізацый і прадстаўнікоў грамадскіх груп Гродзенскай губерні пад кіраўніцтвам актывіста А. Бахановіча. Узнікненне такой арганізацыі было заканамерным: сярод 224 дэлегатаў Усерасійскага з'езда бежанцаў з Беларусі, які праходзіў з 15 па 21 ліпеня 1918 г., 70 % складалі дэлегаты – жыхары Гродзенскай губерні[4]. Адзначым, што А. Бахановіч не вызначаў якой-небудзь нацыянальнай адметнасці сваёй арганізацыі, падкрэсліваючы, што яна аб'ядноўвае ўсіх выхадцаў з Гродзеншчыны. Гэта магло дэзарыентаваць тую частку ўцекачоў, якая арыентавалася на нацыянальныя бежанскія структуры. З другога боку, на той час у названае аб'яднанне ўваходзілі такія разнастайныя па складзе і ідэйных поглядах сваіх членаў арганізацыі, як, напрыклад, «Воінскі саюз Гродзенскай губерні» і «Таварыства аб'яднання і ўзаемнай дапамогі насельніцтва Гродзенскай губерні», прадстаўніцтва Выканкама Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў, з'езда духавенства Гродзенскай губерні, Саюза Грамадзян Гродзенскай губерні, Саюза чыноўнікаў Гродзенскай губерні[5]. У задачах іх дзейнасці падкрэслівалася шмат для каго прывабная грамадская пазіцыя: дзейнасць без уліку нацыянальнасцей і класаў дзеля аказання ўсебаковай дапамогі сем'ям таварystваў і падрыхтоўкі іх да вяртання на родныя месцы[6]. Разумеючы неабходнасць у большай колькасці паўнамоцтваў для ўсталявання стасункаў з расійскімі і нямецкімі ўладамі, А. Бахановіч 4 жніўня 1917 г. абвясціў аб стварэнні Губернскага цэнтральнага камітэта па аказанні дапамогі насельніцтву, які павінен быў аб'яднаць прадстаўнікоў выканкамаў Расійскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў і Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў з ліку жыхароў Гродзенскай губерні «без выключэння ніякіх класаў насельніцтва губерні, без усялякіх абмежаванняў саслоўяў»[7]. Аднак насамрэч такая арганізацыя не была створана, і А. Бахановіч ад імя згаданага аб'яднання прыняў удзел у спробе стварэння чарговай супольнай грамадскай установы.

Па ініцыятыве Польскага таварыства вяртання ў Літву і Беларусь прапаноўвалася стварыць камітэт аб'яднаных нацыянальных і грамадскіх арганізацый вяртання ў Літву і Беларусь. Удзельнікамі спробы такой кансалідацыі былі акрамя прадстаўнікоў таварыства члены татарскіх, яўрэйскіх, рускіх і літоўскай аргаізацый. Але на працягу чатырох пасяджэнняў з 15 сакавіка па 3 красавіка 1918 г. іх удзельнікі не здолелі дамовіцца ні пра аб'яднанне намаганняў, ні нават пра найменне самой арганізацыі[8]. Красамоўнымі выглядаюць прапановы назваў, якія адлюстроўвалі ўстойлівыя палітычныя

[1]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродна. Ф. 736. Воп. 1. Адз. зах. 1. Арк 232 адв. Ф. 196. Воп. 2. Адз. зах. 1.
[2]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродна. Ф. 1213. Воп. 1. Адз. Зах. 2. Арк. 35, 102, 111, 113, 125, 260, 265.
[3]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродна. Ф. 1622. Воп. 3. Адз. Зах. 1. Арк. 3–5.
[4]Протоколы, постановления и материалы Всероссийского съезда беженцев из Белоруссии в Москве 15–21 июля 1918 года. М. : Издательство Белорусского Национального комиссариата, 1918. С. 4–10.
[5]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродна. Ф. 1622. Воп. 3. Адз. Зах. 1. Арк. 31.
[6]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродна. Ф. 1213. Воп. 1. Адз. Зах. 1. Арк. 29.
[7]Нац. гіст. арх. Беларусі ў г. Гродна. Ф. 1213. Воп. 1. Адз. Зах. 1. Арк. 33–33 адв.
[8]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 5115. Оп. 4. Ед. хран. 1. Л. 7–7 об. 8, 13.

і культуралагічныя вызначэнні: «Заходні (Паўночна-Заходні) край», «Беларускія і літоўскія губерні (вобласці)». Найменне «Беларусь» як адметная назва краіны выключалася. Аднак усе прапановы былі непрымальнымі то для адной, то для другой групы нацыянальных прадстаўнікоў[1]. Літоўцы ўвогуле не пагадзіліся пасланць афіцыйных прадстаўнікоў ні на адно з пасяджэнняў, спаслаўшыся на «цьмяныя палітычныя акалічнасці», а іх грамадскае аб'яднанне «Грудас» хаця і прысутнічала на пасяджэннях, але не мела патрэбнага прадстаўнічага статусу. Характар абмеркавання, рэплікі, спрэчкі ўдзельнікаў пасяджэнняў адлюстроўвалі ўзаемны недавер, падазронасць удзельнікаў. Усё закончылася фармальным рашэннем аб стварэнні інфармацыйнага бюро з перыядычнымі зборамі прадстаўнікоў усіх арганізацый[2]. Такі вынік сведчыў пра галоўнае: аб'яднанне грамадскімі намаганнямі ва ўмовах грамадзянскага і нават ваеннага супрацьстаяння было маладасягальным.

Магчымаць аб'яднання і каардынацыі бежанскага руху ў такіх умовах мела толькі ўладная структура. Пра гэта сведчаць звароты А. Бахановіча зімой 1918 г. у Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў з пытаннямі аб прыняцці рашэння пра бежанцаў з Гродзенскай губерні, якія рушылі саставамі з Калужскай губерні, Уфы і Ніжняга Ноўгарада, галадалі і не мелі магчымасці ехаць далей праз забарону перамяшчэння па прыфрантавой тэрыторыі[3].

Яшчэ адным магчымым каардынатарам бежанскага зваротнага руху маглі выступаць адпаведныя структуры Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), ўтварэнне якой было вынікам усяго працэсу беларускага нацыянальнага адраджэння. Яе палітычныя лідары не пакідалі па-за ўвагай бежанскую праблему. Прадстаўнікі БНР ў Оршы прымалі ўдзел у пропуску бежанцаў на тэрыторыю, акупаваную нямецкімі войскамі [6, с. 213]. Ёсць звесткі пра тое, што кіраўнікі БНР вялі працу па магчымым вяртанні асобных груп бежанцаў-беларусаў з Сербіі і Балгарыі. Ажыццяўлялася гэта дзейнасць у 1921 г., калі кіраўніцва рэспублікі ўжо знаходзілася ў эміграцыі, а асноўная маса бежанцаў з беларускіх зямель ішла з усходняга, расійскага, кірунку[4]. На лідараў БНР арыентаваліся і з імі кантактавалі разнастайныя грамадскія беларускія арганізацыі ў Калузе, Варонежы, Туле, Яраслаўлі, аднак кіраўнікі рэспублікі ніякіх рэальных рычагоў уздзеяння з канца 1918 г. ужо не мелі [7, с. 214].

У навуковай літаратуры даюцца розныя ацэнкі гэтых падзей. Напрыклад, В. Утгаф мяркуе, што беларускі ўрад сапраўды імкнуўся наладзіць працу сярод бежанцаў у Расіі. На прыкладзе дзейнасці Беларускага таварыства «Гай» даследчыца робіць выснову пра тое, што «пры стварэнні бежанскіх арганізацый на месцах паралельна афармляліся і дзяржаўныя прадстаўніцтвы БНР» [1, с. 90]. Аднак гэта дзейнасць насіла дэкларатыўны характар [1, с. 91]. Роля і магчымасці прадстаўніцтваў цалкам залежалі ад палітычнага ўплыву кіруючых органаў гэтага дзяржаўнага ўтварэння. У выніку ваенная і палітычная рэчаіснасць 1918–1921 гг. прывяла да таго, што гэтыя планы ажыццяўляліся зусім не ў тых памерах, якія адпавядалі колькасці рэпатрыянтаў у Беларусь.

Фактычна ўвесь механізм вяртання бежанцаў ажыццяўляўся структурамі, якія падпарадкоўваліся новым бальшавіцкім дзяржаўным органам. Апошнія пакідалі пэўную долю ўплыву ў сферы культуры таму ж камуністычнаму Белнацкаму, усе астатнія пытанні трымалі на ўласным кантролі, бо ад пачатку «імкнуліся сканцэнтраваць усю ўладу над бежанцамі» [1, с. 134]. Пра суцэльны кантроль нагадваюць радкі з ліста старшыні Цэнтрпалонбежа ў СНК ад 26 лютага 1918 г. з настойлівай прапановай забароны «ўсялякага самавольнага ўмяшальніцтва асобных арганізацый у паўнамоцтвы цэнтральнай калегіі без прамой на тое задачы... а ўсялякае аматарства і саматужную дзейнасць прыпыняць паўнамоцтвамі, прадстаўленымі ёй Саўнаркамам»[5]. Можна пагадзіцца ў мэтазгоднасці такой жорсткай устаноўкі на парадак каардынацыі бежанскай рээвакуацыі ў тых умовах дыпламатычнай і ваеннай нявызначанасці 1918 г. і палітычнага супрацьстаяння савецкай улады з усімі астатнімі палітычнымі сіламі, у тым ліку беларускімі.

Каб паўней ацаніць крызіснае становішча, у якім апынуліся беларускія палітыкі ва ўмовах фактычнага дыпламатычнага непрызнання беларускай дзяржавы ніводнай з памежных краін (беларускі ўрад, які, па словах А. Луцкевіча, «памяшчаўся ў вагонах скорых паяздоў Еўропы», марна шукаў падтрымкі на міжнародных канферэнцыях і перамовах, бо нікому не быў патрэбны), варта згадаць і насцярожанае стаўленне бежанцаў да нацыянальных беларускіх палітычных лозунгаў [10, с. 105, 122]. З аднаго боку, бежанцы з 1917 г. усё часцей называлі сябе беларусамі: з лістоў у германскае консульства на дазвол выезду груп бежанцаў вынікае, што праз германа-расійскую мяжу з 1 жніўня па 31 кастрычніка 1918 г. рушыла не менш за 61 884[6] тых, хто пазначаў сябе ў дакументах як «бежанцы-беларусы»[1]. З другога боку, гэтыя вымушаныя

[1]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 5115. Оп. 4. Ед. хран. 1. Л. 7–7 об.
[2]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 5115. Оп. 4. Ед. хран. 1. Л. 13.
[3]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 130. Оп. 2. Ед. хран. 265. Л. 2, 10.
[4]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 5782. Оп. 1. Ед. хран. 5. Л. 9–12 об.
[5]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 130. Оп. 2. Ед. хран. 144. Л. 77 об.
[6]Падлік наш. – *В. К.*

мігранты казалі пра сябе як пра расійскіх грамадзян[2]. Існі за незалежнымі нацыянальнымі лідарамі яны не былі гатовыя і не хацелі. «Беларусь павінна быць непадзельнай краінай і ўваходзіць у склад Расійскай Федэратыўнай Рэспублікі», – чытаем у рэзалюцыі ад 28 студзеня 1918 г. бежанцаўбеларусаў у Адэсе [6, с. 229].

Па сутнасці, магчымасць уздзеяння, хаця б намінальную, на вымушаных мігрантаў з беларускіх губерняў у прадстаўнікоў БНР была толькі на акупаваных немцамі, а пазней палякамі, тэрыторыях, калі туды ўжо вярталіся бежанцы, пазначаныя ў польскіх дакументах як «рэпатрыянты». І тут кіраўніцтва БНР звязвала з іх вяртаннем вырашэнне розных, у тым ліку дыпламатычных, праблем (напрыклад, для высвятлення беларуска-літоўскіх адносін у дачыненні да тэрыторый Гродзеншчыны і Віленшчыны). Але адлегласць паміж дэкляраваннем значнасці бежанскага пытання і яго практычным вырашэннем была істотная[3]. Нягледзячы на наяўнасць дасведчаных, энергічных, здольных беларускіх палітыкаў-арганізатараў, такіх як А. Цвікевіч ці З. Жылуновіч, накіраваных на практычную працу з бежанцамі з Беларусі, іх палітычная размежаванасць, з аднаго боку, і поўная адсутнасць дзеючых эканамічных і палітычных рычагоў БНР – з другога, не дазвалялі беларускім лідарам максімальна ўздзейнічаць на працэс рээвакуацыі гэтай катэгорыі насельніцтва, якое ў абсалютнай большасці было заклапочана пытаннямі ратавання сябе, сваякоў і найхутчэйшага вяртання дадому.

## Высновы

Такім чынам, бежанцы з Беларусі вярталіся дадому, абапіраючыся на ўсе магчымасці і прапановы, у тым ліку з боку беларускіх арганізацый, якія спрабавалі ўздзейнічаць на бежанцаў як маглі. Гэта, безумоўна, мела свой плён. Сам факт прысутнасці дзясяткаў і соцень беларускіх актывістаў разнастайных арганізацый у ажыццяўленні рээвакуацыі было новым нацыятворчым фактарам уздзеяння на мігрантаў з Беларусі.

Аднак бежанцы патрабавалі ад палітыкаў вырашэння комплексу бытавых праблем, якія з'яўляліся прыярытэтнымі для іх у параўнанні з пытаннямі палітычнага ўплыву і нацыянальнага асветніцтва. Беларускія нацыянальныя палітычныя дзеячы хоць і займаліся бежанскім пытаннем і добра разумелі яго ролю і значэнне, аднак не мелі палітычных і эканамічных магчымасцей ні комплексна вырашыць бежанскія штодзённыя праблемы, ні каардынаваць працэс рээвакуацыі. Гэта было адной з ключавых прычын аслаблення іх пазіцыі сярод велізарнай масы бежанцаўбеларусаў.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Утгоф В. С.* Белорусские беженцы Первой мировой войны в 1914–1922 гг. : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. СПб., 2003.
2. *Бахурин Ю. А.* Татьянинский комитет. 1914–1917 // Старый Цейхгауз. 2013. № 8. С. 48–53.
3. *Белова И. Б.* Вынужденные мигранты: беженцы и военнопленные Первой мировой войны в России 1914–1925 гг. М. : АИРО-XXI, 2014.
4. *Саматыя В.* Проблема беженцев в Беларуси в годы Первой мировой войны [Электронный ресурс] // Белорус. журн. междунар. права и междунар. отношений. 2003. № 2. URL: http:/www.evolutio.info/index.php?option=com_content&task=view&id=631&itemid=5 (дата обращения: 05.05.2016).
5. *Кукса А. Н.* Западная область: минский период (март 1917 – февраль 1918 г.) // Наука – образованию, производству, экономике : материалы 11-й Междунар. науч.-техн. конф. : в 4 т. (Минск, 27–29 ноября 2013 г.). Минск, 2013. Т. 4. С. 59.
6. *Круталевич В. А.* Рождение Белорусской Советской Республики. (На пути провозглашения республики. Октябрь 1917 – декабрь 1918). Минск : Наука и техника, 1975.
7. *Ляхоўскі У.* Школьная адукацыя ў Беларусі падчас нямецкай акупацыі 1915–1918 гг. Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства ; Вільня : Інстытут беларусістыкі, 2010.
8. *Скалабан В. В.* Белорусский Национальный комиссариат (январь 1918 – март 1919) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02. Минск, 1982.
9. *Prymaka-Oniszk A.* Biezenstwo–1915. Zapomniani uchodzy. Wolowiec : Wydownictwo Czarne, 2016.
10. *Чарнякевіч А. М.* Чужы сярод сваіх: Павел Аляксюк і беларускія «паланафілы». Мінск : А. М. Янушкевіч, 2017.

[1]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. Р-3333. Оп. 7. Ед. хран. 20. Л. 46, 47, 49, 55, 66–66 об., 78, 84, 122, 123, 127, 128, 142, 152, 172, 173, 181, 184, 185, 196, 201–201 об., 205, 206, 208, 209, 214, 226, 233, 240, 247, 251, 257–257 об.

[2]Постановление Общего Собрания белорусов-беженцев – жителей Казанской губернии о сохранении Белоруссии в составе РСФСР. От 23 апреля 1918 г. // Государственные границы Беларуси : сб. док. и материалов : в 2 т. Минск, 2012. Т. 1. (март 1917 – ноябрь 1926) / сост. : В. Е. Снапковский [и др.].

[3]Гос. арх. Рос. Федерации. Ф. 5782. Оп. 1. Ед. хран. 1. Л. 107.

## References

1. Utgoff V. S. [Belarusian refugees of the First World War, 1914–1922] : thesis of diss. … PhD (history) : 07.00.02. Saint Petersburg, 2003 (in Russ.).

2. Bachurin J. A. [Committee by Tatyana. 1914–1917]. *Staryi Tseikhgauz* [Old Zeughaus]. 2013. No. 8. P. 48–53 (in Russ.).

3. Belova I. B. [Forced migrants: refugees and prisoners of war of World War I in Russia 1914–1925]. Moscow : AIRO-XXI, 2014 (in Russ.).

4. Samatya V. [The problem of refugees in Belarus during the World War I]. *Beloruss. zhurnal mezhdunarodnogo prava i mezhdunarodnykh otnoshenii* [*Belarus. j. of int. law and int. relat.*]. 2003. No. 2. URL: http:/www.evolutio.info/index.php?option=com_content&task=view&id=631&itemid=5 (date of access: 05.05.2016) (in Russ.).

5. Kuksa A. N. [Western region: Minsk period (March 1917 – February 1918)]. *Nauka – obrazovaniyu, proizvodstvu, ekonomike* [Science – society, production and economy] : materials of the 11th int. sci.-techn. conf. : in 4 vol. (Minsk, 27–29 Novemb., 2013). Minsk, 2013. Vol. 4. P. 59 (in Russ.).

6. Krutalevich V. A. [The birth of the Belarusian Soviet Republic. (On the way of proclamation of the Republic. October 1917 – December 1918)]. Minsk : Nauka i tekhnika, 1975 (in Russ.).

7. Ljahowski V. [School education in Belarus during the German occupation of 1915–1918]. Białystok : Belaruskae gistarychnae tavarystva ; Vilnius : Instytut belarusistyki, 2010 (in Belarus.).

8. Skalaban V. V. [Belarusian National Commissariat] : thesis of diss. … PhD (history) : 07.00.02. Minsk, 1982 (in Russ.).

9. Prymaka-Oniszk A. [Refugees 1915. Memories of a migrant]. Wolowiec : Wydownictwo Czarne, 2016 (in Pol.).

10. Charniakevich A. M. [Stranger among his own: Pawel Aleksyuk and Belarusian «polonofils»]. Minsk : A. M. Yanushkevich, 2017 (in Belarus.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 18.09.2017.*
*Received by editorial board 18.09.2017.*